Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 32 (61) Пятніца, 30-га верасьня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адр[...] і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—[...]нальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цан[...]
„ „
Загранін[...]
[...]кцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
[...]адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

НАДКЛЯСАВ[...] НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І[...]

Кожны Народ складаецца з розных групаў насяленьня, ці, як кажуць, клясаў.

Гэтак і Беларускі Народ складаецца з пэўных клясаў. Аднак жа Беларускі Народ знаходзіцца трохі у іншых клясавых узаемаадносінах, чым многія іншыя народы Эўропы, якія маюць сваю ўласную дзяржаўнасьць.

У Беларускага Народу няма ўласнай *буржуазыі* і надта слабая кляса рабочых. Можна сьмела сказаць, што Беларускі Народ складаецца з дзьвёх галоўных клясаў: сялянства і умыслова-працоўнай інтэлігэнцыі А з гэтага трэба зрабіць пэўныя вывады. Перадусім нельга датарнаваць да Бел. Народу розных доктрынаў, якія галоўныя асновы свайго істнаваньня будуюць перадусім на клясавай барацьбе. Адсюль вывад: усе тыя беларускія групы, якія гэтую клясавую барацьбу, нават клясавую обасобленасьць кладуць у аснову сваей праграмы — вельмі мыляюцца. А гэтую памылку пэўныя белар. групы робяць. Перадусім Грамада гэты прынцып клясавай барацьбы прабавала прытарнаваць да сваей праграмы. Яна пайшла ў сваім кабінэтскім доктрынэрстве гэтак далёка, што нават знайшла нейкі беларускі пралетарыят, „магутную беларускую работніцкую клясу" і прабавала прышчапіць Беларускаму Народу нейкую спэцыяльную работніцка-сялянскую ідэалёгію. Ясна, што ідэалёгія была памылковая, і праца Грамады аказалася збудаванай на пяску. Грамада была моцная сваёю нэгатыўнай тактыкай, скіраванай ў бок барацьбы з палянізацыяй і з буржуазіяй *не беларускай*, а ўплывы ўсялякага роду з бальшавіцкага ўсходу гэтую барацьбу ўмацнялі і паглыблялі.

Але, як толькі штучнаму падбіваньню бальшавіцкіх агітатараў быў паложаны рашучы канец, дык адразу прэстыж, а з ім і актыўная праца Грамады ўпала. Пазытыўнымі, рэальнымі уступкамі у бок справядлівых жаданьнкў і патрэбаў Беларускаму Народу — была разьвеяна і самая псыхолёгічная магутнасьць Грамады.

Ёсьць другая беларуская група, якая ў сваей працы прабуе замкнуцца у аднэй клясе: гэта — „Сялянскі Саюз".

Мы прызнаём значэньне і патрэбу арганізацыі сялянства. Але нельга гэтае сялянства, нават пакуль яно яшчэ не зарганізавана, пхаць на шлях клясавай барацьбы.

Нельга гэтае маласвядомае, малаадукаванае і мала-культурнае сялянства ізаляваць ад беларускай інтэлігэнцыі — А гэтак адразу робіцца, як толькі Сял. Саюз становіцца на шлях клясавага змаганьня. Сель-Саюз Яреміча ідзе нават далей. Ён прабуе нешта плясьці нават аб „Сялянска-работніцкай ідэалёгіі", што ужо значыць — мяшацца да зусім не сваіх справаў.

І вось, робячы гэтыя памылкі, органы Грамады „Наша Праўда" і Сель-Саюзу—„Сель-Ніва" прабуюць крытыкаваць той напрамак, які прадстаўляе Бел. Нац. Партыя. „Наша Праўда" проста залічвае нас да буржуазыі (як між іншым і Сель-Саюз. і хадэкаў!), не даказаўшы самага існаваньня беларускай буржуазыі. А Сель-Саюз нашае прызнаньне польскай дзяржаўнасьці бяз сэнсу суе да нашае нацыянальнай ідэалёгіі. Мы лічым і сучаснасьць ужо даказвае (як даказалі выбары ў самаўрады!), а будучыня і зусім дакажа, што Беларускі Народ мае перад сабою толькі адзіны правідловы шлях, адзіную правідловую праграму, якая няухібна прывядзе Народ да поўнага вызваленьня.

Гэтай праграмай ёсьць: **надклясавая, нацыянальная еднасьць Народу. Не у барацьбе слабых і неарганізаваных яшчэ беларускіх клясаў, а у арганізаваньні гэтых клясаў, у іх нацыянальнай згодзе і салідарнасьці і у пазытыўнай творчай працы — пэўная будучыня Беларусі.**

Палітычны агляд.

Ужо даўно не заўважывалася гэткага зацішша ў палітыцы, як цяпер. Нават

агульны сход Лігі Народаў з перавыбарамі да Рады Лігі не выклікаў вялікага зацікаўленьня.

На гэты раз, здаецца, не падымалася ў закулісных конфэрэнцыях пытаньне аб бальшавіках. Толькі Штрэзэман маніўся навязаць контакт з Брыянам і Чэмбэрлэнам і паварушыць пытаньне аб хутчэйшай эвакуацыі акупірованых вобласьцёў. І, здаецца мог, надзеецца на памыснасьць сваей акцыі, пераканаўшы с аіх калегаў па нарадзе Нобэля у міралюбівых імкненьнях Нямеччыны, калі б не падлажыў яму сьвіні Гіндэнбург танэнбэргскімі урачыстасьцямі.

У Танэнбэрзе (Усходняя Прусія) адбылося адкрыцьце памятніка ў успамін танэнбэргскай перамогі немцаў над другой расейскай арміяй гэн. Самсонова. Самым цікавым у гэтым была не прысутнасьць самага прэзыдэнта фэльдмаршала Гіндэнбурга на гэтых урачыстасьцях, як галоўнага прадстаўніка дзяржавы і нават яго прамова, наскрозь прасычаная ваенна-імпэрыялістычным духам, а

абмен прывітальнымі тэлеграмамі між бывшым нямецкім імпэратарам Вільгэльмам і Прэзыдэнтам Рэспублікі Гіндэнбургам.

Як у тэлеграме Вільгэльма, гэтак сама і тэлеграме Гіндэнбурга успамінаецца бывшая ваенная магутнасьць Нямеччыны і выказваецца надзея на адбудову гэтай магутнасьці ў будучыне. Гэта дружаскае узаемнае прывітаньне выгнаньніка імпэратара з прэзыдэнтам дэмакратычнай рэспублікі вельмі не падабалася нямецкай рэспубліканскай прэсе. Зразумела, ня прыходзіцца гаварыць аб тым, што гэта зьявілася сьвежаю вадою на млын францускіх нацыяналістаў, назадаволеных уступчываю палітыкаю Брыяна і ня верачых у міралюбівыя завярэньня Штрэзэмана. Апошні мусіў выступіць з запярэчаньнямі перад заграніцаю прэсаю ў Жэнэве, але гэтае запярэчаньне толькі больш падкрэсьліла яго салідарызованасьць з тым, што было сказана Гіндэрбургам у Танэнбэрзе. Ды фактычна Штрэзэман і ня мог запярэчыць таго, што яму, як міністру заграніцьных справаў, ня была наперад ведама праграма Танэнбэргскіх урачыстасьцяў, якія, апрача ўнутранага значэньня, як спосаб падняць нацыянальна-ваенны дух нямецкага народу, былі яшчэ разлічаны на вонкавы эфэкт. Хаця-ж Штрэзэман і не стараўся вельмі вытлумачывацца ў гэтым перад заграніцаю. І хоць ніхто з суседзяў Нямеччыны ні на хвілю не сумляваўся ў запраўдных плянах „рэспубліканскай" Нямеччыны, аднак ня было прычынаў падтрымліваць вечна-ворожыя адносіны, калі б не спрыялі гэтаму самі немцы. Ня гледзячы ні на вэрсальскі трактат, ні на Лёкарно і Туары, нават нямецкія афіцыяльныя чынікі, як сам Прэзыдэнт Рэспублікі, ня скрываюць таго, што Нямеччына выразна імкнецца да адбудовы папярэдняй сваей імпэрыялістычнай магутнасьці, якая несоўмясьціма з паваенным складам сярэдняй Эўропы і істнаваньнем новых дзяржаваў, узьнікшых на грузах Нямецка-Аўстрыйска-Расейскіх манархіяў. Вось дзеля чаго адразу зьмянілася жэнэўская атмасфэра, якая яшчэ напярэдадні Танэнбургскіх урачыстасьцяў вельмі спрыяла акцыі Штрэзэмана, маючай на мэце хутчэйшае звальненьне нямецкіх вобласьцяў Францускімі вайскамі. Ня толькі Брыян, нават Чэмберлен прымушаны быў спыніць далейшыя закулісныя гутаркі з Штрэзэманам, для якога гэтая сэсія Лігі Народаў прайшла зусім бязплодна. Гэткім чынам у адносінах між Нямеччынай і яе суседзямі, асабліва францыяй і Польшчай, зноў наступіла хвілёвае асьцюдзеньнё. Хаця гэта ня выклікала паважных скуткаў, бо жыцьце нарэшце бярэ свае.

Няменшаю сэнсацыю зрабіла заява Літвінава, што быццам

Саветы прызналі даўгі Францыі і думаюць плаціць іх.

„Галоднай куме заўсёды хлеб на вуме", — кажа народная прыказка. Ведама, што для французаў вялікае значэньне мае пытаньне аб урэгуляваньні расейскіх даўгоў. А бальшавікі, як тонкія псыхолёгі, выкарыстоўваюць гэты настрой французаў. Але ніхто з паважна мысьлячых людзей не паверыць славам залгаўшыхся бальшавіцкіх лідэраў, асабліва, калі рэч ідзе аб грашовых забавязаньнях бальшавікоў. Па першае яны ня маюць самі грошаў, якія раскрадзены камісарамі і выдаткаваны на раздзьмухіваньне сьвятовай рэвалюцыі. Уся сутнасьць француска-савецкіх перагавораў палегае на тым, што ўзамен славесных абяцанак бальшавікі хочуць атрымаць ад Францыі грашовую пазыку, а не плаціць ім старыя даўгі. А па другое гэта пытаньне ня можа быць выраш[а]на з аднэй Францыяй бяз удзелу Англіі, Амэрыкі, Бэльгіі і іншых крэдытораў бывшай Расеі. Калі-б толькі Радавы Урад хоць на славах згадзіўся плаціць каму-небудзь з крэдытараў старыя даўгі, дык гэта паслужыла-бы прэцэндэнтам і для рэшты крэдытараў трэбаваць ад бальшавікоў выплаты даўгоў У праціўным выпадку гэта выклікала-бы новую хвалю незадаволеннасьці бальшавікамі, што было-бы з пасьпехам выкарыстана іх ворагамі на чале з Англіяй. Але тонучы хапаецца за саломінку. Калі трэба было „Ратаваць сацыялістычную бацькаўшчыну", бальшавікі згадзіліся на Брэст-Літоўск і падпісалі Рыскі мір, забавязаўшыся выплаціць Польшчы 30 мільёнаў зал. рублёў, з якіх да гэтай пары ня выплачаны ні адзін рубель. Дык што ім значыць абяцаць і цяпер французам, што яны будуць плаціць даўгі, калі яны прымушаны былі пайсьці нават на царкоўны Брэст-Літоўск унутры дзяржавы. Як відаць з Французамі нічога ня выходзіць, бо прыйшлося нарэшце ўбраць Ракоўскага з Парыжу. Дык вось, пачынаецца зноў флірт з амэрыканскім капіталам. У гэтым аднашэньні вельмі характэрна заява гэнэральнага сэкрэтара міжнародовага прафэсыянальнага саюзу Лазоўскага, які між іншым сказаў, што маюцца азнакі, быццам у бліжэйшай будучыне распачнуцца перагаворы між прафэсыянальнымі саюзамі Радаў і Амэрыкі. Што урэгуляваньне справы аб даўгах Амэрыкі лягчэй, чым з іншымі дзяржавамі, дзякуючы невялікай суме, а Амэрыка шукае рынкаў для сваей прамысловасьці. Ні для каго ня сэкрэт, што бальшавікі вельмі квапяцца устанавіць „добрыя адносіны" з амэрыканскім капіталам, але пытаньне, ці захочуць гэтага самі амэрыканцы?

N.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Мейсцовы Ваяводзкі Камітэт Грамадзянскай Запамогі Ахвярам Паводкі у Усх. Галіцыі апублікаваў наступную адозву да насяленьня:

„Цяжкім ударам пала стыхійнае бедства паводкі на нашыя Палуднёва-Усходнія Ваяводзтвы.

Весткі аб гэтым сапраўдным Божым папушчэньні абеглі ўсе куткі Рэспублікі, выклікаючы ўсюды жах, глыбокае спачуцьце і шляхэтнае імкненьне з скораю запамогаю для амаль зусім зруйнаваных і найбяднейшага насяленьня.

У гэткіх выпадках ня можа быць нават і мовы аб розьніцах: нацыянальных, клясавых, рэлігійных ці якіх небудзь іншых. Блізкія нам людзі, нашы спаўграмадзяне — галодныя і бяз даху над галавою! Дзеці там уміраюць, хваробы косяць бязпомашнае насяленьне, гіне рэшта цудам уратаванай маемасьці.

Было-бы несправядлівым зваліваць усю ратунковую акцыю на Урад. Дзяржаўны скарб замкнуты на дзесяць замкоў у рамах бюджэту. Не прыгатаваны на раптоўныя і неспадзеўныя выдаткі. Як сьвет шырокі і доўгі, усюды і заўсёды усе насяленьня дзяржавы сьпяшыць прыйці з запамогаю да мейсцовай катастрофы — якой ніхто ня можа прадбачыць.

Няхай-жа і нам памогуць: гэроічнае рашэньне, хуткасьць выкананьня, пачуцьце грамадзянскага абавязку. Нарэшце няхай паможа сэрца, чуткае да нядолі бліжняга.

Няхай яшчэ раз Рэспубліка пераканаецца, што можа рахаваць на Віленшчыну ў кожнай патрэбе І калі рэч ідзе аб грамадзкай справе, мы ня ведаем нават і цені дзельніцовай рожніцы.

На ратунак пацярпеўшым ад паводкі! Няхай кожны дасьць свой грош! З яго будзе хлеб для галодных і прытулак для бяздомных".

Падпісалі:

Владыслаў Рачкевіч, Ваявода і Старшыня Ваяводзкага Грамадзкага Камітэту Запамогі Ахвярам Паводкі.

Архіяпіскап Яблжыкоўскі, арх. Феадосі, рабін сэнатар Рубінштэйн, муфці Шынкевіч, супэрінтэндант кс. Ястржемскі, пастар Лоппэ, гэн. Бурхард-Букацкі, прэзыдэнт места Фолееўскі, рэктар У. С. Б. праф. Пігонь і цэлы шэрэг прадстаўнікоў віленскіх адміністрацыйных, судзебных і грамадзянскіх колаў.

Першая ластаўка.

Т-ва Беларускае Школы атрымала ад Віленскага Куратарыуму адказ на пытаньне, дзе і якія беларускія школы будуць сёлета адчынены у межах дзейнасьці Віленскага Школьнага Округа на падставе паданых бацькамі дэкляярацыяў. З гэтага адказу вынікае, што **у гэтым годзе будзе адчынена чатырнаццаць школ чыста беларускіх і дзесяць двухязычных-польска-беларускіх (утраквістычных).** Праўда гэта невялікая лічба ў параўнаньні з некалькімі сотнямі беларускіх школ, якія павінны быць адчынены на падставе дэкляярацыяў, паданых бацькамі школьным інспэктарам, але і гэта ужо добрая адзнака новага курсу пасьля Грабскага міністэрства асьветы у адносінах беларусаў. Мы надзеемся, што гэта толькі першая ластаўка, першае прабіцьце лёду, залёгшага у міністэрстве асьветы за часы урадаваньня, благой памяці, Ст. Грабскага, пасьля чаго трэба прабіваць далей гэтую прорубь, але толькі не грамадаўскім рэвалюцыйным кулаком, а новымі масавымі падачамі дэкляярацыяў інспэктарам з жаданьнем адчыненьня далейшых беларускіх школаў.

Для агульнага ведама падаем сьпісак новаадчыненых беларускіх і польска-беларускіх урадавых народных школаў:

ПАСТАЎСКІ ПАВЕТ:

Гулі, Жасьнянск. гм. — белар. шк—1 кляса.
Старыя Габы „ „ —белар. шк.—4 клясы.

ДЗІСЬНЕНСКІ ПАВЕТ:

Шаркаўшчына, Шарк. гм —двухязычн.—5 кл.
Малажаны, Донкыцк. гм —белар. шк —2 кл.
Баяры Пліска гм. — —двухязычн.—2 кл.
Рудвікі, Празароцк. гм. — двухязычн. - 2 кл.

ВЯЛЕЙСКІ ПАВЕТ:

м. Вялейка — — — двухязычн.—7 кл.
Коловічы, Вялейск. гм. — двухязычн.—5 кл.
Ценцевічы, „ „ белар. шк —2 кл.
Халопы, „ „ белар шк.—2 кл.
Варовічы-Карал., Куранецк гм.—бел. шк.—1 кл.
Журыхі „ белар. шк.—1 кл.
Рэчкі „ двухязычн.—2 кл.
Туроўшчына „ белар. шк.—1 кл.
Каралеўцы, Вайстам. гм. —белар. шк.—1 кл.
Клаўсі, Касьцянев. гм. — белар шк.—2 кл.
Хаценчыцы, Хаценч. гм. - двухязычн. 4 кл.
Осава, Крывіцкае гм — двухязычн —4 кл.
Выхалавічы „ „ — белар. шк.—2 кл.
...жа, Іжанскае гм — — белар шк.—2 кл.
Слабада „ „ — — белар. шк. 2 кл.
Таўць „ „ — — белар. шк.—2 кл.

МАЛАДЭЧАНСКІ ПАВЕТ:

Насілава, Лебедзеўск гм.—двухязычн.—2 кл.
м. Маладэчна „ „—двухязычн. - 7 кл.

Першая выстаўка Беларускай Прэсы.

На папярэднім тыдні у гмаху галоўнай школы Варшаўскага Унівэрсытэту адбылося адкрыцьце першай выстаўкі беларускай і украінскай прэсы Слявянскаю Лігаю і Інстытутам Досьледу Нацыянальных Справаў. З прывітальнаю прамоваю выступіў перад сабраўшыміся прадстаўнікамі навучнага і палітычнага сьвета старшыня камітэту выстаўкі інж. Картыньскі, які сьцьвердзіў, што мэтаю выстаўкі зьяўляецца азнаямленьне польскага грамадзянства з беларускаю і украінскаю прэсаю, як найбольш характэрнаю праявою нацыянальнага жыцьця двох братніх народаў, пражываючых у межах агульнай дзяржавы. Выстаўку адкрыў ад імя міністэрства Асьветы Ендржэевіч, сьцьвердзіўшы, што урад з задаваленьнем вітае арганізаваньне выстаўкі, якая пэўна паможа бліжэйшаму узаемнаму знаёмству пражываючага на тэрэні Польскай Рэспублікі грамадзянству. Затым сябры камітэту выстаўкі інж. Карпінскі, інж. Земкевіч, праф. Аўсеенко, праф. Лукашэвіч, Ст. Папроцкі і М. Сьвехоўскі паказвалі выстаўку прыбыўшым гасьцям.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

НОВЫ РАДАВЫ ПАСЛАННІК У ПОЛЬШЧЫ.

Аканчальна радавым паслаңнікам у Польшчы назначаны Дзімітры Багамолаў. Будучы пасланнік радзіўся ў 1890 г. у Петраградзе. Ад 1915 да 1918 г. знахадзіўся у нямецкім пляну. Дыплёматычную кар'еру распачынае з 1920 г. у народным камісарыяце заграні́чных справаў С.С.Р.Р. У 1922 г. назначаецца першым сэкрэтаром пасольства у Вене і ў 1924 г. аж да разрыву дыплёматычных адносінаў з Англіяй першым сэкрэтаром пасольства ў Лёндане.

ПОЛЬСКА-РАДАВЫЯ ПЕРАГАВОРЫ.

Міністэрства заграгічных справаў паведамляе: апошняя гутарка Чычэрына з пасланнікам Паткам прывяла да пагоджаньня некатарых параграфаў, датычных гарантыйнага пакту. Пас. Патэк хвілёва выехаў на Каўказ для інспэкцыі польскага консулята у Тыфлісе Пасьля прыезду ў Маскву конфэрэнцыя з Чычэрыным распачнецца зноў.

УНЕВІНЕНЬНЕ ЗАБОЙЦАЎ ТРАЙКОВІЧА.

Міністэрства заграгічных справаў паведамляе, што сьледавацель Бітульскі пасьля допросу „швэйцараў“ савецкага пасольства у Варшаве Гусева і Шлетцэра і ня ўступая ў разгляд прынцыповага пытаньня, чы падлягаюць указаныя асобы компэтэнцыі польскага суда — не знайшоў у іх чыне адзнакаў праступленьня, на падставе якога маглі-бы быць пацягнуты да судовай адказнасьці. На падставе гэтага міністэрства заграгічных справаў выдала Гусеву і Шлетцэру візы на выезд да Масквы, які і адбыўся 20 г. м.

УКРАІНСКАЯ „ГРАМАДА“

Украінскія паслы, выступіўшы з Украінскага Клюбу, незадаволеныя палітыкаю гэтага Клюбу, заснавалі новы пасольскі Клюб пад назовою „Сельроб“. Сябрамі гэтага Клюбу зьяўляюцца: Чучмай, Рашун, Макувка і Казіцкі.

ЯК ВЕСЯЛЯЦЦА „ПРАЛЕТАРСКІЯ“ ДЫПЛЕМАТЫ.

З Варшавы паведамляюць, што ў суботу у заместарым рэстаране „Sielanka“ меў мейсца наступны выпадак, гэроем якога аказаўся заступнік савецкага пасланніка у Варшаве Ульянаў. Ульянаў у таварыстве 8 кабетаў і 4 мужчынаў разьвясяліўшыся заказаў аркестру граць савецкі гімн. Апрача гэтага яго таварыства трымала сябе някультурна і правакацыйна ў адносінах гасьцей, займаючых суседнюю лёжу. Адзін з гасьцей паклікаў паліцыю, якая патрэбавала ад „вясёлай кумпаніі“ паказаць свае дакумэнты. Калі стала ведама, што гэта „вясёлая кумпанія“ з савецкага пасольства ў Варшаве, на салі пачалося абурэньне. „Вясёлая кумпанія“ скора пасьля гэтага пакінула рэстаран.

ЗАХАПЛЕНЬНЕ БАЛШАВІКАМІ ПОЛЬСКАГА АФІЦЭРА.

Савецкі пагранічны патруль захапіў паручыка 16 бат. К. О. Р. Станіслава Франка. Радавыя пагранічныя ўлады скіравалі яго да Менску. Трэба падкрэсьліць, што гэта ня першы выпадак захапленьня бальшавіцкаю пагранічнаю стражаю польскіх пагранічных афіцэраў, неасьцярожна прыблізіўшыхся да савецкай граніцы. Гэта на дыплёматычнай мове называецца „добрасуседзкімі“ адносінамі.

З заграніцы.

АБМЕН ТЭЛЕГРАМАМІ ВІЛЬГЭЛЬМА II І ГІНДЭНБУРГА.

У зьвязку з адкрыцьцем памятніка ў Танэнбэрзе ў успамін вялікай перамогі немцаў над расейцамі ў 1914 г., б. імпэратар Вільгэльм прыслаў прэзыдэнту Гіндэнбургу прывітальную тэлеграму, на якую Гіндэнбург адказаў у сваю чаргу тэлеграмаю.

ШТРЭЗЭМАН ЗГАДЖАЕЦЦА З ГІНДЭНБУРГАМ.

Нямецкі міністар заграгічных справаў Штрэзэман у размове з рэдактарам парыскай газ. „Le Matin“ заявіў, што словы Гіндэнбурга зьяўляюцца выразам агульнага настрою нямецкага народу і не пярэчаць мірнай палітыцы Нямеччыны.

ВОДГУКІ ТАНЭНБЭРГСКАЙ МОВЫ.

Пуанкарэ ў Парыжу, міністар Барту ў Мароко і бэльгійскі міністар Жаспар у Остэндэ выступілі з прамовамі, зьяўляючыміся адказам на Танэнбэргскую прамову Гіндэнбурга, у якіх яны рэзка асуджаюць паводзеньне Нямеччыны ў часе апошняй вайны.

СПАТКАНЬНЕ БРЫЯНА З ШТРЭЗЭМАНАМ.

Брыян і Штрэзэман мелі кароткую размову ў Кулуарах Лігі Народаў. У гэтай размове міністры дакрануліся пытаньня аб прамове Гіндэнбурга пад Танэнбэргам і адносінаў з радаваю Расеяй.

РАДЫ АДКЛІКАЮЦЬ РАКОЎСКАГА.

З Масквы паведамляюць, што аканчальна пастаноўлена адклікаць Ракоўскага з Парыжу. Матывіруецца гэта тым, што Ракоўскі быццам блага інфармаваў народны камісарыят з гранічных справаў аб ходзе француска-савецкіх перагавораў і дзякуючы гэтаму выклікаў нефартунную дэкляярацыю Літвінава і француское запярэчаньне. Маскоўскі ўрад высоўвае думку высылкі французскім урадам да Масквы спэцыяльнай камісіі для вядзеньня беспасрэдніх перагавораў з савецкім урадам.

БАЛЬШАВІКІ БЫЦЦАМ ПЛАЦЯЦЬ ДАУГІ?

Радавая прэса апублікавала заяву Літвінава аб француска-савецкіх адносінах. Літвінаў катэгарычна заявіў, што француская і савецкая дэлегацыі дайшлі да поўнай згоды па пытаньню аб даўгах. Гэты дагавор не падпісаны толькі дзеля таго, што француская дэлегацыя не прыняла яшчэ прапазыкі савецкай дэлегацыі у справе пазыкі для радаў. У працягу 6 ці месяцаў будзе выплачана французкім трымацелям расейскіх вартасьцёвых папераў першая рата у суме 30 міл. зал. франкаў.

ТРАГІЧНАЯ СЬМЕРЦЬ НЯМЕЦКАГА ПАСЛАННІКА Ў ЗЛ. ШТАТАХ.

У Нямеччыне здарыўся сэнсацыйны выпадак. Апасьне аэраплян, у якім сярод пасажыраў між іншымі знахадзіўся нямецкі пасланнік у Зл. Штатах Мальтцан, упаў і разьбіўся. Пілёт і ўсе пасажыры, ў тым ліку і Мальтцан, забіты. Мальтцан зьяўляецца галоўным ініцыятарам Рапальскага трактату і належыў да найлепшых дыплёматаў цяперашняга часу.

БУНТ У ВІЛЬКАМІРЫ.

Рызкая газэта паведамляе, што ў Вількаміры збунтавалася частка мейсцовага гарнізону. Пасьля некалькі часовай перастрэлкі між бунтаўшчыкамі і вернымі ураду атрадамі удалося узбунтаваўшуюся частку гарнізону акружыць і разбраіць.

НЕПАРАДКІ У ХАНЬКОУ.

У Ханькоў дайшло да непарадкаў, скіраваных проці англічан і японцаў. У японскім квартале таўпа пачала грабіць дамы дзеля чаго японскія атрады прымушаны былі пусьціць у ход аружжа. Затым непарадкі перанясьліся да кітайскай часткі места. Аб'яўлена ваеннае палажэньне. Вуліцы забарыкадаваны. Па месту курсуюць патрулі.

ТАЙФУН Ў КІТАЙСКІХ ВАДАХ.

Страшны тайфун, прайшоўшы над Паўднёва-Кітайскім морам недалёка ад Тон-Конга, зусім зьнішчыў больш 20,000 дамоў і затапіў сотні лодак. Ахвяраю тайфуна пала 5,000 чалавек. Каля вострава Валоа затануў японскі карабль у 1,5000 тонаў. Экіпаж удалося ўратаваць

У чырвоным пекле.

НОВЫЯ РАСТРЭЛЫ Ў ПЕТРАГРАДЗЕ.

Пасьля некалькі дзён расправы акружны суд прыгаварыў „за удзел у тэрорыстычнай акцыі“ да сьмяротнай казьні праз расстрэл Балмосава, Сольскага, Страевога і Самойлова. Адэркос прыгавораны на 10 гадоў турмы

Алесь Гарун і яго творчасьць.

(*Дапаўненьне*).

Пад вышэйпрыведзеным назовам у №№ 27-ым і 29-ым „Беларускага Слова“ быў зьмешчаны артыкул п. Сьветазара аб вядомым беларускім песьняры А. Прушынскім. Дзеля таго, што праз недагляд у частцы другога артыкулу (№ 29 з дня 8. X-27 г.) у тым мейсцы дзе аутар абгаварывае зборнік Гаруна—„Матчын Дар“, быў пераблутаны, а часткова зусім прапушчаны цэлы аддзел, зьмяшчаючы ў сабе ацэну паасобных вершаў зборніку, даем ніжэй гэты аддзел поўнасьцю.

(*Рэдакцыя*)

. . ..А цяперака спынімся праз момант на паасобных вершах зборніку.

Вось-жа асаблівым хараством формы, або глыбінёй ці арыгінальнасьцю думкі вызначаюцца наступныя вершы: прадусім ўступны верш зборніку — поэтыцкае *confiteor* песьняра: „*Людзям*“ (ст. 5) — нязвычайна пявучы, інтымны, хапаючы за сэрца верш—скарга, далей *ў аддзеле I-шым*: 1) „*Хай ня льюцца*“... — нешта быццам кліч *de profundis*, быццам малітва за бяздольную Беларусь, якую ўзносіць поэт, бы біблійны прарок за укрыжаваны свой народ; пачынаецца верш гэтак:

„Хай ня льюцца дажджы цёмна-хмарныя
„Над зьмярцьвелаю пашаю.
„Хай пачнуцца гады хлебадарныя
„Над зямелькаю нашаю.

„Хай красуецца жытам, пшаніцаю,
„Каласочкамі цяжкімі,
„Хай ўзмацуецца Боскай правіцаю
„І Ўсетворчымі ласкамі“.. і г. д. і г. д.

„*Ты мой брат*“.. (ст. 16) — патрыятычны наказ беларускаму народу аб пашане да роднае мовы, таго адзінага скарбу, які ад дзядоў і прадзядоў захаваўся „у сялянскай аграбленай хаце“ Беларуса: пісаны быў гэты верш з нагоды чатырохлецьця „*Нашае Нівы*“, найстарэйшай, калі ня лічыць „Нашай Долі“, беларускай, легальнай газэты, 3) пяруновы верш „*Юдам*“ (ст. 18) які прыходзіцца з радні Купаліну вершу „Ворагам беларушчыны“, толькі, калі тамака пераважае момэнт нацыянальны, тутака—тэма распрацавана у плошчы прадусім соцыяльнай; акрамя гэтага заслугоўваюць на увагу: 4) „Начныя думкі“ (ст. 10), 5) поўны біблейнай зважнасьці верш: „Усе з аднэй мы выйшлі нівы“ (ст. 21), прысьвячаны Коласу і зьяўляючыся вольнай парафразай вядомай эвангэлічнай прыповесьці аб сейбіце і 6) „Песьня“ (ст. 22) — прыгожанькі вершык — жальба, утрыманы у народным стылі, шчыры і мілагучны; *у аддзеле II гім* (ст. 23 — 72): 1) вельмі арыгінальная па форме „*Завіруха*“ (ст. 34), поўная настрою містычнай нейкай жуды, 2) поўны размаху верш „*Эх сягоньня*“... (ст. 41), нагадуючы адзін з вершаў Цёткі, зьмешчаны у „Беларускай Скрыпцы“, 3) глыбока-філёзофічнае „*Nocturno*“ (ст. 50); вось адрывак з яго:

„. . . Стаіць магутны лес, ізноў убраны
„Ў зялёны ліст дагадлівай рукой,
„І п'ець спажыўны cок, старыя гоіць раны
„Зірні: якая моц! Зірні, які спакой!
„Што год ўміраець ён парой асеньнай,
Каб зноў аджыць, убачыўшы вясну.
„І гэтак ўсё ідзець чаргою пераменнай:
„То скіне сон з вачэй, то зноў ідзець да сну“...

— у апошніх двух радках бачым вельмі характэрную да сьветагляду Гаруна наагул, галоўную тэзу ўсяго гэтага твору: Усё на на сьвеце мінае, усё ідзе сваем адвечным чарадом, чалавек мусіць пагадзіцца з непарушнымі законамі прыроды, 4) „*Хто сказаў* ... (ст. 54) — насьледаваньне аднаго з вершаў Канапніцкай, 5) містычная „*Навука*“ (ст. 56), абапёртая на учэньні Корану і усходнім фаталізьме (улада Року), 6) філёзофічная імпрэсыя „*Адбітак*“ (ст. 57), 7) ня ўступаючая хараством і глыбінёй думкі найлепшым творам вялікага Максіма — імпрэсыя „*Як ліст вярбінкі маладой*“ (ст. 58), 8) „*Ноч*“ (ст. 63)— магутны крык адчаю, тытанічны бунт, скованае няволяй энэргіі, арліны парыў у высь, найпрыгажэйшы мо' верш Гаруна; вось яго пачатак:

„Ў гэту ноч мне ня ў моч —
„Німа сілы чакаць і маліцца. .
„Каб я ўмеў, каб я сьмеў
„Узьляцець, паляцець ці разьбіцца!“

і далей:

„Як сакол, як арол
„Я падняўся-б высока страшэньне
„Я-б узяў, я-б украў
„І сабе і усім адпушчэньне“...

9) „*Малітва*“ (ст. 67) –дзе праз вусны Хрыстуса, поэт, у маліцьвенай форме, выказвае свае уласныя пачуцьці і патрэбы 10) поўны грамадзкіх думак верш „*Поэту*“ (ст. 69) і 11) сымболічны верш „*Муляру*“ (ст. 72) у якім у асобе гэтак зразумелага у Гаруна работніка муляра, заклікаецца да працы над будаваньнем „уласнай хаты“ — беларускай дзяржаў асці — увесь беларускі народ; акрамя гэтага трэба яшчэ адцеміць тут гэткія вершы: 12) „У выгнаньні“ (ст. 25) — талентны абраз жудаснае, панурае атмасфэры, абкружаючай поэтаў засланьні, 13) поўнае трагічнага надрыву „Вясельле“ (ст. 26), 14) мэланхолічную „Восень“ (ст. 29), 15) дасканальны малюнак сыбірскае прыроды — „Павакол“ (ст. 32), 16) „На сьмерць“ (ст. 42) — найбольш суб'ектыўны верш Гаруна, пісаны пад сьвежым уражаньнем сьмерці ягонага бацькі, 17) несамавітую „Змору“ (ст. 61), 18) „Слабасьці (ст 70) і 19) „Жыцьцё (ст. 71). урэшце ў *аддзеле III-цім* (ст. ст. 73 — 125) зьвяртаюць увагу гэткія вершы: 1) фантастычныя, панурыя „*Хаўтуры*“ (ст. 86), 2) трагічны верш „*Сын*“ (ст. 97), а гэтак жа: 3) дасканальны малюнак беларускае прыроды — „У прыпар“ (ст. 79), 4) настраёвая „Песьня“ (ст. 84), 5) сумныя „Два каханьні“ (ст. 88), 6) вельмі арыгінальная „Казка“ (ст. 90), 7) „Хатка“ (ст. 92), „Жабрачка“ (ст. 94) і дзьве поэмкі: 1) „*Варожба*“ (ст 104) — засьцянковая аповесьць і 2) „*Канец Паўлючонка*“ (ст. 111) — якія асабліва цікавы сваей консэрватыўнай ідэолёгіяй, нагадываючай творы беларускіх шляхоцкіх рамантыкаў XIX-га сталецьця.

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Распаусюджывайце сваю газэту

Раяшнік.

(Сэкрэты і пасольскія дыеты).

Вось „Kurjer Wileński“ нам вестку прынёс, што разлом ў „Сель-Саюзе“ пайшоў ўжо ў сур'ёз, і новы ўжо з'езд вось адбыўся, і „спадарскі“ ўрад на'т стварыўся...

Але, што гэта за ліха, што робіцца неяк ўсё ціха?!...

І праз польскія толькі газэты свае адчыняюць сэкрэты „сельсаюзныя“ павадыры...

Вось тут іх і разьбяры?...

Адны самазванцы, хоць ня ў „спадарскі“ сэкрэт—стварылі нумар другі „нац.-камітэт“.

Другія-жа, быццам ў адказ, а кажуць — Антошкін прыказ — на Ярому пасла наляцелі і... зьелі...

Бывайце-ж здаровы паночкі Ярома і пане Адаме!

Перад выбарамі апынуцца у яме ня кожнаму гэта завідна, але далей будзе ўжо відна, ці промах тут ваш, а мо і заслуга, што Антона вы выгналі друга і здолелі місюгіны ўрэшце пазбыцца, і няма ўжо чаго тут дзівіцца, што Ярома у іншым кірунку шукае сабе ўжо ратунку...

Шукай, браце, шукай, дый пра „мандат“ не забывай!..,

Нарэшце, каб ужо не забыцца — вось „Хатка“ пачала варушыцца — ма быць гурковы сэзон ўжо прайшоў, бо бачыш:

Адчыт адбыўся, то хор беларускі стварыўся, то з'яжджаюцца раптам ужо да яе — і з вёсак сябры ўсё свае.

І „Рады“ сябры, і „Прасьветы“ і тыя, што цэлае лета за радных сваіх ўсё біліся—ў выбарным камітэце лічыліся...

Хай-жа з'яжджаюцца, да ўсяго прыглядаюцца, бо надходзіць пара творная, да сойму выборная...

Шэйнэ-Катарынка

УЛЬТЫМАТУМ АПАЗЫЦЫІ.

Нямецкая газэта паведамляе з Масквы, што апазыцыя патрабавала ад кіруючых органаў камуністычнай партыі легалізацыі апазыцыі яшчэ да кангрэсу партыі. Гэты крок апазыцыі носіць ультыматыўны характар. Апазыцыя цяпер рашыла працаваць незалежна ад таго, згодзяцца цэнтральныя камуністычныя органы з іх жаданьнямі ці не.

ПЕРАМЕНЫ ў ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Быўшы царскі вахмістр, а цяпер „чырвоны гэнэрал“ Будзены назначаны заступнікам старшыні рэвалюцыйнай ваеннай рады на места уступіўшага Уншліхта, які зноў варочаецца да Г. П. У. Афіцэрскі корпус чырвонай арміі павялічыўся на 5,000 новых афіцэраў, якія скончылі афіцэрскую школу. 80% новых афіцэраў належыць да камуністычнай партыі. Паводле паходжаньня 37% належыць да работніцкай клясы, 33% да сялянства і рэшта да мяшчанства.

ЛІК КАМУНІСТАЎ У ШЭРЭНГАХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

У зьвязку з надходзячымі выбарамі да камуністычных арганізацыяў у паасобных частках чырвонай арміі радавая прэса падае, што ў шэрэнгах чырвонай арміі знаходзіцца сябраў і кандыдатаў камуністычнай партыі 90,000 і камсамольцаў — 130.000.

НАЦ. МЕНШАСЬЦІ НА УКРАІНЕ.

Да рады нацыянальнасьцяй пры Цэнтральным Камітэце С.С.Р.Р. паступіла скарга расейскай, жыдоўскай і нямецкай нац. меншасьцяў на Украіне. Жалабшчыкі указваюць на недапусьцімую палітыку украінскага радавага ураду, праводзячага гвалтоўную украінізацыю і нарушаючую права меншасьцяў. Украінскі урад пагражае цяпер закрыцьцем усіх расейскіх школаў на Украіне. Разгляд гэтага пытаньня пацягне за сабою няўнікнены канфлікт між Маскоўскім і Украінскім Урадам. У Маскве праэктуецца перагляд граніцаў украінскай рэспублікі з тым, каб выдзяліць з Украіны чыста расейскія вобласьці.

З БЕЛАРУСКАГА УНІВЭРСЫТЭТУ ў МЕНСКУ.

Менская часопісь „Зьвязда“ падае, што на агульную лічбу 506 слухачоў, прынятых да беларускага унівэрсытэту ў гэтым годзе, прыходзіцца 287 беларусаў, 176 жыдоў і 24 расейцы. Паводле партыйнай прыналежнасьці з новапрынятых 10% складаюць камуністы, 20% камсамольцы і рэшта безпартыйныя.

НОВАЕ ЗЕМЛЕТРАСЕНЬНЕ ў КРЫМУ.

Крым падлёг новаму землетрасеньню. Наймацнейшы таўчок, трываўшы 7 сэкунд, асабліва адчуваўся у Сэвастопалі і Ялце. 500 найбольшых будынкаў разбурыліся, шмат пашкоджаных. Шмат раненых і забітых. Матэрыяльны ўбытак дасягае 30 мільёнаў руб.

Вялікія Беларускія Мітынгі.

Мітынг у Сіняўцы.

21 верасьня у м. Сіняўцы адбыўся вялікі беларускі мітынг. Пагода была добрая і народу сабралося некалькі тысячаў, акурат было царкоўнае сьвята—г. з „Багач“. Яшчэ раніцаю да Сіняўкі неспадзеўкі прыехала некалькі пэпээсаў з Клецку, маючы так сама замер зрабіць мітынг. Прышпілілі на высокім мейсцы свой чырвоны штандар і пачалі зазываць сялян. Але сяляне ня йшлі на іх заклік і чакалі свайго — беларускага аратара.

Толькі а палове 2-ой гадз. прыехаў з цягніку Старшыня Бел. Нац. Рады п. А. Паўлюкевіч. Тады пэпээсы прабавалі зрабіць мітынг у... гумне! І зрабілі!. Чалавек каля 20 цікаўных хлапцоў сабралося ў гумне. Пэпээсы, як заўсёды, папрычэлі, палаялі паліцыю, урадоўцаў і скарэй давай Бог ногі! Бо дзе-ж ім канкураваць з беларускімі прадстаўнікамі.


П. Паўлюкевіч гаварыў $1^1/_2$ гадзіны. І натоўп народны сур'езна, сьвядома, даючы сабе справу з таго, што гаварыў прамоўца, слухаў свайго былога доктара, а сяньня рэдкага госьця з беларускага віленскага цэнтру. Гаварыў п. Паўлюкевіч аб тым, што новае паветра, якое ідзе з Варшавы, стала чутно і на нашых многапакутных землях беларускіх. Што першыя ластаўкі — першыя беларускія ўрадовыя школы адчынены ўрадам Маршалка Пілсудзкага. Што пры ўрадзе Пілсудзкага беларусы маюць свае праўдзівыя беларускія гмінныя рады і сваіх першых беларускіх войтаў. Што ў бедах і няшчасьцях, якія зваліліся на галаву нашых сялян, як недарод, градабіцьце і навальніца, урад прыйшоў з вялікай дапамогай. Што спыніліся шыканы з боку куратарыума ў адносінах да Клецкай Бел. Гімназіі. Што па ўсіх кутках беларускіх шырыцца і расьце беларуская культура і асьвета: адчыняюцца аддзелы „Прасьветы“, закладаюцца бібліятэкі, арганізуюцца аматорскія трупы. Няма папярэдніх гэнэрал - ваяводаў, якія ўславіліся безпадстаўнымі арыштамі тысячаў бел. сялян. Няма паліцыйнага гастэрунку каля дому навагрудзкага ваяводы, а сам ваявода без асаблівай ахраны езьдзіць па вёскам і асабіста раздае грошы пацярпеўшым ад навальніцы, як гэта была ў Навагрудзкім павеце.

Аднак жа, ня гледзячы на тыя значныя зьмены да лепшага, зроблена для бел. Народу яшчэ надта мала. Трэба змагацца далей, але дарогай не гвалту, не рэвалюцыі, на якую клікала Грамада,—а дарогай арганізаванасьці, нацыянальнай сьвядомасьці і салідарнасьці, і перад усім працы. Дарма, бяз высілкаў, нішто не даецца.

Мітынг скончыўся воклікам у чэсьць Маткі — Беларусі і Маршалка Пілсудзкага, які натоўп народу спаткаў воплескамі.

Шчырае дзякуй нашым праўдзівым беларускім нацыянальным правадырам, якія не забывалі і баранілі нас у цяжкія мамэнты, не забываюць і цяпер. А пэпээсам радзім больш у Сіняўку і не зьяўляцца. Бо не ашукаць ім больш нашага народу. Разумеем добра, што ім хочацца мандацікаў, бо прыбліжаюцца выбары. Але ня ўбачаць яны мандацікаў ад нас беларусаў, як сваіх вушэй.

Сінявец.



Пасьля адкладу сэсіі Сойму і Сэнату.

(„Expr. Wil.“).

Мітынг у Гародзьках.

21 верасьня ў дзень Нараджэньня Прэчыстай Багародзіцы Городькі, Забрэскае гміны, Валож. павету заўсёды ўрачыста абходзяць свае Царкоўнае сьвята. Ня гледзючы на тое, што апошні год большасьць сялян знаходзілася пад упlывам „Грамады“, якую не надта цікавяць царкоўныя сьвяты, аднак рэлігійнасьць яшчэ моцна трымаецца паміж нашага народу і дзеля гэтага і ў гэтым годзе на сьвята зьехалася каля 2,000 сялян з суседніх вёсак.

Набажэнства адпраўлялі Валожынскі Протаірэй з 5 іншымі суседнімі бацюшкамі.

На набажэнстве быў прысутны прадстаўнік Беларускае Нацыяналнае Рады п. Тодар Вернікоўскі, які прыехаў з Вільні наўмысьле каб падчас сьвята асабіста пазнаёміцца з настроем сялянства і пры мажлівасьці азнаёміць іх з ідэолёгіей Б. Н. Р. і Партыі і заклікаць сялян на гэты шлях эвалюцыйнага здабыцьця правоў адраджаючаясе Беларусі.

Падчас набажэнства п. Вернікоўскі, як вераючы і душэўна чуткі да рэлігійных абразаў, сам асабіста падпяваў на клірасе, а на'т і прачытаў Апостала.

Па сканчэньню Царкоўнае службы казаньне сказалі протаірэй Валажынскае Царквы і настаяцель Славенскае Царквы о. Ул. Насекайло, а пасьля на дзядзінцу мейсцовага псаломшчыка адбыўся вец, на якім тысячная таўпа прысутных навастрожана слухала словы п. Вернікоўскага. Распачынаючы сваю прамову, ён заявіў, што ён ёсьць прадстаўніком Б. Н. Р. і Партыі, найгалоўнейшай ідэйнай мэтай якіх ёсьць імкненьне да адраджэньня Беларусі, каб 14 мільённы Беларускі Народ у сям'і іншых народаў сьвета заняў-бы тое дзяржаўнае мейсцэ, якое павінен мець народ з багатай гісторычнай прошласьцю, культурай і гаспадарственнасьцю.

Далей ён адзначыў, што вялікая вайна, якая дала магчымасьць іншым і меншым народам, як Ліцьвіны, Латышы і Эстонцы, здабыць сваю незалежнасьць, на жаль для Беларускага Народу, дзякуючы таму, што тэрыторыя яго амаль што ўвесь час была тэатрам ваеннага фронта, не дала гэтага, але нават яшчэ і падзяліла яго, аддаўшы адну частку бальшавікам, другую — Польшчы. Але ў Польшчы, з якой мы жылі пад адной страхой супольнай гаспадарственнасьці ў працягу пяцёх стагодзьдзяў, цяпер яка апячуліся на палажэньні нацыянальнай меншасьці... Далей, адцаніўшы кірункі папярэдніх урадаў Польшчы і цяперашняга ўраду Маршалка Пілсудзкага, адцаніўшы пакутнае жыцьцё беларуса пад бальшавікамі — ён, разглядзеўшы яшчэ шкодную працу нашых паслоў, адарваўшыхся ад народу, перайшоў на тое, якім шляхам трэба ісьці, каб пры лёяльнасьці да Польскае Дзяржавы, без рэвалюцыі па волі бяз рожных проці-дзяржаўных выступленьняў, — паступова; крок за крокам, але моцна і цьвёрда здабываць належныя нам правы па Польскай Конституцыі і дабіцца ўрэшце аўтаноміі, як першага этапа да поўнай незалежнасьці. Як раз гэта той шлях, на які стала Б. Н. Р. і Партыя, якія ўсе магутней заваёўваюць сабе сымпатыі Народу.

Дык няхай-жа жыве—закончыў ён сваю прамову — сучасны ўрад, які ўжо даў пэўныя гваранты таго, што зьменіцца нашая доля на лепшае!

Няхай жыве Маршалак Язэп Пілсудзкі!

Няхай жыве Беларусь і вялікі народ беларускі!..

Хай жыве беларуская культура!..

Хай жывуць і істнуюць Беларускія Нацыянальныя арганізацыі, якія з пасьпехам ужо бароняць нашыя нацыянальныя інтарэсы!..

Хай-жа жыве і наш брацкі Польскі народ і ўсе тутака прысутныя!..

Пасьля веца некатарыя з прысутных былі запрошаныя на абед да о. Міхаіла Станкевіча, дзе ўжо лілася супакойная гутарка а больках і сучасных патрэбах парахфіі..

Шкода, што о. Павел Макарэвіч з Вішнева да гэтага часу яшчэ не перакапаўся, што пара ўжо ў нас тутака запомніць аб „единой и недѣлимой“.

Добры адказ далі о. Макарэвічу п. Вернікоўскі і о. Якуб Катовіч з Лоска, якія падкрэсьлілі о. Макарэвічу, што Беларусь ёсьць, жыве і будзе жыць. Пачасьцей-бы да нас прыяжджалі-бы прадстаўнікі з цэнтру, дык і жыцьцё нашае было-б сьвятлейшае і лягчэйшае, а то да гэтага часу нават а ні водны пасол не заглядываў.

Госьць

Асеньні вечар.

Ціха і спакойна
Ў хаце мужыка.
Пралетае вольна,
Вецер із кутка.
Смольная лучына
Свой кідае блеск,
Кожную хвіліну
Выдавая трэск.
Дрэмлець каля печкі
Тут-жа на тапчане,
Хлопчык не вялічкі
У старым кафтане.
На старым услоне
Дзед сівы сядзіць
Свае думкі лове:
Як мог век пражыць.
Баба недалёка
Ад яго прадзе,
Ей на сэрцы лёгка,
Ціха што-сь пяе.

Месячык крадзецца,
Ў іхняе вакно.
Лёганька кладзецца
Ей на валакно.
Толькі не спакойна,
Як бы ў жальбе,
Вецер дзесь прасторна
Вые ў трубе.
Веткамі рабіна
У вакно бубніць,
Як-бы сірата
Па бацькох тужыць.
Бы сказаць хацела
Што за шчасьце тым,
Хто схаваўся сьмела,
У кутку сваім.
Хай не наракаюць
На свой цяжкі лёс,
Бо спачынак маюць
У холад і мароз.

У. В.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Выбары гміннай рады у м-ку Падароск.

(Ваўкавыскага пав.)

Нарэшце і мы дачакаліся выбараў у Гмінны Самаўрад. У склад выбарнага валаснога камітэту ўвайшлі: старшыня—войт гміны Е. Чаплееўскі і сябры: Радзевіч Ал. Дуброўскі Пр. і адзін асаднік.

6-га жніўня г. г. а 11 гадз. дня адбыліся выбары. Выбаршчыкаў было вызначана 100 чал. з якіх 7 чал. не зьявілася, а двох выдалілі, як ня меўшых 25 г. Галасаваньне было па сьпісках і закрытае. У часе выбараў захоўваўся спакой і поўны парадак. На выбарах быў прысутны заступнік п. старосты п. Чайкоўскі, выбары адбыліся па ўсім правілам, вынікі якіх наступныя: сьпісак №1, на чале якога стаяў абшарнік п. Ішэм Сегень з маёнтку Краскі. Пан спагадны людзкому гору і бядзе, а дзеля таго бліжэйшыя вёскі ад яго маёнтку галасавалі за яго. Другім прайшоў з гэтага сьпіску б. войт Е. Чаплееўскі, трэцім — Гудко Ян, б. афіцэр.

Сьпісак № 2, асадніцкі атрымаў 10 чал., але прайшоў не асаднік, а тутэйшы беларус, якога яны паставілі на першым мейсцу — А. Тарасэвіч—паручнік, вярнуўшыся нядаўна з Францыі. Рэшта радных прайшлі з 3 га сьпіску,—беларусы сяляне.

19 жніўня адбыліся выбары войта. Адзінагалосна быў выбраны стары войт Эдвард Чаплееўскі, які карыстаецца павагай усіх людзей, маючы добрую адукацыю і добра знаёмы з сваей працай, бо ўжо служыць у нас войтам з 1921 г.

На заступніка войта выбраны Т. Каласоўскі, тутэйшы жыхар, маючы сярэднюю адукацыю, і яшчэ даволі малады.

27 жніўня адбыліся выбары у Сэймік павятовы. Пададзена было тры кандыдатуры: Т. Каласоўскі, А. Тарасэвіч і Ішэмыс Сегень—абшарнік. Прайшоў Т. Каласоўскі і А. Тарасэвіч. На гэтым усе выбары і закончыліся. Усіх 13 радных, — г. зн. 10 радных у гмінную раду. 2 у сэймік і 1 войт, з каторых усе 12 *сьвядомыя беларусы*, толькі 1 каталік абшарнік Сегень, але і ён спагадны беларускай культуры.

„Беларус“

Абразкі выбараў.

(Слонімшчына).

Дня 31 VII. г. г. у м. Бытэні, Слонімскага павету адбыліся выбары войта, заступніка яго і іншых.

Паміж сябрамі Гміннае Рады было шмат Радных беларусаў, якія паводле істнуючых языковых уставаў мелі і маюць права ўжываньне сваей мовы не толькі тэарэтычна, але і практычна ў жыцьці самаўрадаў.

Аднак-жа слонімскі староста, Др. Дарош (быццам вызваленец!), які мае рэпрэзэнтаваць шчырую дэмакратыю, будучы прысутным на выбарах, цьвёрда заявіў сваім „магутным тонам“ радным беларусам, што на выбарчых паперках да галасаваньня яны павінны (!?) пісаць прозьвішчы кандыдатаў на войта і інш. толькі па... польскі, а калі хто ня можа, дык за яго зробіць гэта „przewodniczący“ сабраньня, якім быў у той час Вайніловіч, войт з „номінацыі“ і адначасова кандыдат на войта.

Як сказаў нам стараста, так было і зроблена, а рэзультат такій што, дзякуючы „спрыгу“ свайму, Вайніловіч астаўся войтам у Бытэні,

Цяпер зразумелі беларусы, як па „польску“ пісаў карткі Вайніловіч — і падалі скаргу ў Ваяводзтва.

Ідзе сьледзтва ў чым кончыцца, ня ведаем, але ведаем, што нам зроблена крыўда, вялікая крыўда, якіх шмат у нашай многапакутнай Бацькаўшчыне...

Ось, якія былі выбары...

Аса

Пашырайце роднае слова!

Тутэйшая хроніка.

— **БЕЛАРУСКІ ХОР.** Пры „Беларускай Хатцы ў Вільні“ з'арганізаваўся хор пад кіраўніцтвам рэгэнта архіярэйскага хору Тодара Матьвеяця. Спеўкі адбываюцца па аўторках і пятніцам а 5 г. у памешканьні „Бел. Хаткі“, Завальная вул. 6—4.

— **МЭМАРЫЯЛЬЧЫКІ ВЫЛЯЗАЮЦЬ З МЯШКА.** Варшаўскі карэспандэнт „Dz. Wil“. (№ 218) падае:

„Як мы даведаліся, ў Дзікаве на зьездзе абгаварывалася пытаньне аб устасункаваньні захоўных (zachowawczych) арганізацыяў да новых выбараў. З прычыны выбарчых канцэпцыяў высувалася нават магчымасьць стварэньня агульнага блёку консэрватараў—санатараў з пэўнымі адшчэпамі нацыянальных меншасьцяў: з беларусамі пасла Ярэміча,— украінцамі і жыдамі“...

Так такі і напісана чорным па беламу: з беларусамі пасла Ярэміча!?. Усякія комэнтары тут лішнія. „Мэмэрыяльчыкі“ п. Ярэміча так і выпіраюць з мяшка. А яшчэ ня так даўно п. Ярэміч запярэчываў гэтаму...

— **СПЫНЕНЬНЕ УЖЫВАНЬНЯ 50 зл. БАНКНОТАУ І-шай ЭМІСІІ.** З днём 1 жніўня г. г. Польскі Банк прыступіў да спыненьея з руху 50 зл. банкнотаў І эмісіі з датаю 28 лютага 1919 г. Банкноты гэтыя перастаюць быць праўнымі сродкамі плацяжу з днем 1 студня 1928 г. Ад 1 лютага 1928 г. да 31 студня 1929 г. яны будуць прыймацца Польскім Банкам для абмену. Пасьля гэтага аканчальнага тэрміну банкноты трацяць сваю грашовую вартасьць.

— **ГЛІНАБІТНЫЯ БУДЫНКІ.** У зьвязку з распачатай акцыяй будовы глінабітных будынкаў на тэрыторыі віленскага ваяводзтва паведамляюць, што цяпер маюцца школы ў наступных мейсцах. у Крэве, Ашмянскага пав. (6), Вішневе, Вялейскага пав. (2), Дашліцах і Дробчыцах, Пастаўскага пав. па 1, Вольнімінах, Дрысьвятах і Тыльжы, Браслаўскага пав. па 1. 22 верасьня выехала для інспэкцыі гэтых школаў спэцыяльная камісія ў складзе інспэктара Акружнай Віл. Дыр. Грам. Працы інжэн. Сіла—Навіцкі, дэлегат міністэрства Грам. Працы Зелінскі, кіраўнік рэфэрату адбудовы віленскага ваяводзтва Будрэвіч і іншыя. Сьцьверджана, што праца вядзецца інтэнсыўна. Адначасна заўважана вялікае зацікаўленьне мейсцовага насяленьня справаю аб глінабітным будаўніцтве і шмат каго зьвярталася да сябраў камісіі за інфармацыямі адносна сыстэмы будаваньня агнятрвалых дамоў.

Ганьба перад Народам.

29. VIII. 27 г. ў м. Слоніме адбываліся выбары сябраў „Wydziału Powiatowego“ слонімскага сойміка. На дзенным парадку, паміж іншымі была пастаўлена справа „djet“ (пайкоў грашовых) якія маюць права акрэсьліць сабе паны сябры слонімскага сойміка (а калі былі-б дабрыя людзі, ідэйныя, то маглі-б і адрачыся).

Гутарка на тэму грашовых пайкоў цягнулася ажно 4 (слоўна чатыры!) гадзіны і ў канцы была прагаласавана прапазыцыя сябры сойміка, б. сябры „Грамады“ — нейкага Альховіка з Дзярэчына і жыда Тэлерштэйна з Бытэня, разьмер „djety“ браць для сябе паводле VI рангі, г. зн. такія, якія бярэ сам.. ваявода ў суткі, а апрача гэтага, па 30 грошаў праездных ад кілямэтра.

Язэп Апанасік і інш беларусы—нацыяналісты абурыліся на гэта і ўнясьлі прапазыку, каб замест 15 зл. і 30 грошаў ад кілямэтра — браць толькі па 3 зл. у суткі г. зн. столькі, колькі можа запрацаваць наш сярмяжнік, і адначасова падкрэсьлілі цьвёрда, што гэтыя вялізарныя сумы пайкоў сябры сойміка — будуць браць з крыві сваіх бацькоў, ц. зн. з падаткаў, але прапазыка гэта ў часе галасаваньня была правалена панамі Альховікамі, Тэлерштэйнамі, Мэндэлямі і Серкевічамі, якія лічацца „абаронцамі“ беднага беларускага селяніна і работніка.

Сколькі гэта пацягне новай бяды для вёскі, колькі пральецца сьлёзаў у той час, калі войты будуць сьцягіваць падаткі, каб было-бы чым заплаціць 28 сябрам сойміку пайкі паводле VI рангі (ў суткі 15 зл. і 30 гр. ад кілямэтра,) няхай самі жыхары асудзяць, я толькі падкрэсьлю „шчырасьць“ „ідэйную працу“ б. грамадаўцаў, якія для сваей асабістай карысьці — з крыўдай для шырокіх працоўных мас вёскі—яшчэ нічога не зрабіўшы, (праўда пагутарылі 4 гадзіны над пайкамі!), ужо казалі, каб шэрая маса заплаціла ім за „працу“.

Дык ведайце-ж усе працоўныя Слонімшчыны, хто ёсьць нашым абаронцам і сьцеражэ правоў сялянства!.

Калі ня верыце гэтаму, — папытайце на сходах у паноў радных, копіі пратакола (павінны мецьі) з паседжаньня сойміка ад 29. VIII. г. г. і паглядзіце добра!

Даведаецеся шмат чаго!!

Прысутны.

Юрыдычныя парады.

Грам. Н. Л-ку. Запытаньне: Бяздзетны брат мой гадоў таму 30 усынавіў нейкага хлапца-сірату. Паміраючы ў 1920 г. ён апісаў усыноўленаму ўсю сваю маемасьць. Аб гэтай маемасьці мы судзіліся, але справу праігралі і маемасьць засталася за ўсыноўленым. У гэтым годзе памёр дзяцька мой і брата які ўсынавіў сірату, Пасьля яго засталася маемасьць але нікога з насьледнікаў няма: дзяцей ня меў, а жонка памёрла гадоў 10 таму. Да маемасьці памёршага, якою заўладаў я, як бліжэйшы крэўны, цяпер чапляецца ўсынаўлены і жадае атрымаць палову як насьледнік майго брата — ўсынавіцеля. Ці мае ён якія правы і ці выйграе, калі будзе судзіцца?

Адказ: Калі ўсыноўленный ня ёсьць само, па сабе крэўным памёршага дзяцькі і то крэўным у роўнай з вамі ступені (г. зн сын брата, сястры) —то ніякага права ня мае. Калі будзе Суд — дакажэце сьведкамі, што ён зусім чужы вашай сямье і Суд яму адмовіць у дамаганьнях на насьледзтва.

Грам. Я. Я-ку. Запытаньне: Сёлета памёр мой дзед, пасьля якога засталася 8 дз. зямлі і сякія такія будынкі (ён сам не гаспадарыў). З бліжэйшых крэўных памершага ёсьць: я, мая сястра (яшчэ не замужняя), дзеці памершага майго брата і ўнук роднага брата дзеда. Зямлю захапіў ён, бо жыве побач. Зямля надзельная. Было гэта так: дзед свайму сыну, а майму бацьку купіў засьценак з суседняга маёнтку і аддаў гэты засьценак, а надзел заставіў пры сабе з жонкай і дачкай — сястрой майго бацькі і яе незаконным сынам. Жонка дзеда і дачка памёрлі ўжо некалькі гадоў таму, — сын дачкі забіты ў часе вайны. Ці мае права ўнук брата дзеда на зямлю, якое і як атрымаць тое, што з наследзтва нам належыцца?

Адказ: Па закону бліжэйшая ступень крэўных атрымлівае ўсё. Вы, сястра вашая і дзеці вашага брата зьяўляецеся бліжэйшымі ў нападаючай лініі крэўнымі. Унук брата насьледацеля стаіць далей ад вас аж на 3 ступені. Ніякаго значца, права на маемасьць ён ня мае. Падавайце ў Суд позву да забраўшага няправільна зямлю. У позве вызсьніце як вы прыходзіцеся памершаму, а як забраўшы зямлю і прасіце Суд (Міравы) прызнаць вас у правох насьледзтва, адабраць зямлю і перадаць вам. Вы ўсе і (сястра) па новаму Закону маеце роўныя часьці, г. зн. $1/3$ часьці ўсяго. Пры гэтым дзеці брата ўсе разам атрымліваюць гэтую $1/3$ часьць.

Грам. К. Ч-ву. Запытаньне: Я, пасьля сьмерці жонкі застаўся адзін як палец. Дзеці ў нас былі, ды каторы памёр, а 2 сыноў забілі на вайне. Каб мець на старасьць апеку і дагляд, я ўзяў да сябе ў дом сына маей малодшай сястры з сямьёй. Ен абавязаўся ўтрымліваць мяне да сьмерці і пахаваць як сьлед па хрысьціянску. Я за гэта аддаў яму маемаемасьць і зрабіў у натарыўса духоўную (тастамант) па якому адпісаў пляменьніку на вечнасьць усю сваю маемасьць. Цяперака пляменьнік, а асабліва яго жонка, прост морыць мяне голадам і пагражае зусім выгнаць вон, бо, кажа, зямля ў натарыўса аддана яму. Ці можа ён забраць зямлю і як абараніцца? Я хацеў-бы ўзяць цяпер ўдаву другога пляменніка і аддаць ёй і яе дзецям усю маемасьць. Ці і як гэта зрабіць?

Адказ: Тастамант ці дамовы, ці натарыяльны— ніякіх правоў не дае да сьмерці тэстатара. Толькі пасьля сьмерці вашай і зацьвярджаньня тастаманту праз Суд — ён мае сілу. Гэта першае. Другое: тастамант вы ў кожную хвілю можаце зьнішчыць і напісаць новы, перадаючы маемасьць іншай асобе. Значэньне мае толькі апошні па часу напісаньня тастамант. Дзеля гэтага зрабіце вось што: Зьвярнецеся да Натарыўса і напішэце другі тастамант якім адкажэце маемасьць каму хочаце. У гэтым другім та таманце напішэце, што першы вы ўневажняеце. Вось і ўсё. А каб пазбавіцца ад тых, хто седзючы ў вас на вашай гаспадарцы крыўдзіць вас, нарушаючы гэтым умову — падайце ў Міравы Суд позву, просючы высяліць іх Да тагож вы можаце і самі ўзяць у свае рукі распараджэньне вашай гаспадаркай і кіраваць ёю, або даручыць гэта іншай асобе

Грам. К. Ю-ку. Запытаньне: Гадоў 20 таму, выяжджаючы на службу на чугунцы ў Расею, брат мой пакінуў сваю часьць надзелу пры мне. Ні арэнды, нічога я яму не плаціў, дый ён і не цікавіўся зусім, што з яго зямлёй. У 1923 годзе ён з сямьёй прыехаў сюды і такжа служыць на чугунцы і жыве ў горадзе С. Аб зямлі ён нат і не напамыкнуў мне. Тымчасам у леташнім годзе да мяне зьявіўся далёкі наш сваяк, які таксама жыў здаўна ў Расеі і паказаў мне кантракт зроблены ў 1923 г. па якому брат аддаў яму ў арэнду аж на 36 гадоў з варункам пабудаваньня хаты і г. д., усю сваю зямлю. Я удава, сын малалетні яшчэ. Карыстаючыся з гэтага сваяк амаль сілком адабраў у мяне ў восені папар і засеяў жыта, сёлета пакасіў сенажаць, і забраў і сёлетні папар. У мяне засталося цяперака толькі $1/3$ частка таго, што некалі належыла брату. Што рабіць, як абараніцца і ці можна што небудзь зробіць каб зямля засталася пры мне?

Адказ: Калі вы ўладалі, як пішаце ўжо 20 г. зямлёй, не плацячы ніякай арэнды, г. зн. як сваей ўласнай — вы набылі на гэтую зямлю права ўласнасьці па даўнасьці. Зьвярніцеся ў Суд з позвай аб прызнаньні за вамі правоў уласнасьці па даўнасьці і аб адстраненьні захватчыка ад уладаньня зямлёй

Грам Ярмаловічу А. — Пад назовам інвалідаў „Французкай рэгістрацыі“ разумеюцца інваліды, каторых зарэгістравалі ў 1920—1921 годзе францускія камісіі. Калі ваш дзядзька быў зарэгістраваны гэткай камісіяй — ён, згодна з апошняй пастановай Найвышэйшага Адміністрацыйнага Трыбуналу № 3816/25 мае права на івалідзкую рэнту. Тады хай зьвернецца ў месцовае паветовае Р. К. U.

Грам. Я. Крэцку. — З наступнага нумару ў нашай газэце пачне друкавацца закон, у якім вы знойдзеце падрабязны адказ на цікавячую вас справу. Там-жа будуць і паясьненьні, што і як.

Паштовая скрынка.

І. Самосей, І. Камар, К. Жэлайдзік, П. Булыко, А. Майсак, М. Стасюлевіч. С Гінко, Т. Гаціло, І. Лісоўскі, Б, Губко, — пробныя нумары высылаем прысылайце як найхутчэй падпісныя грошы.

М. Грынько, С. Мікуць — 1 злот атрымалі; газэту высылаем.

ТАКІ ПАСАДЗІЎ!

Яшчэ змалку Язэп Кудра і Петра Яшчар надта дружылі. Ня толькі ніколі не паспрачаліся з сабой усур'ез, але баранілі адзін другога перад іншымі. Іх за гэтую дружбу называлі братэльнікамі.

Жартаўнікі казалі:

— Вунь, братэльнікі пайшлі, цалавацца-мілавацца будуць.

Хто яго ведае, якая таму была прычына. Жылі яны побач; шнуры іх у полі так сама йшлі побач. Здавалася-б. мала ёсьць даных дзеля гэтакай дружбы. Бо-ж ведама, што найбліжэйшыя суседзі — амаль заўседы ворагі. Мала там што: куры, або парасяты улезуць ў гарод, дзеці абтрасуць яблыню, а то бабы пералаюцца. Ведама-ж ніяк нельга папусьціць гэткіх выпадкаў: сэрца-ж ня каменьі Дый трэ яшчэ ведаць, што абыдвае саўсім-ткі ня былі надта ціхенькімі. Язэп — дык прост агонь: што ня так — дык беражыся! Ізноў-жа Пётра, хоць і не такі шпаркі — але затое страшэнна быў заядлы. Пакуль былі яны шчэ хлапцамі — зьяўляліся пастрашкай для усей моладзі вясковай. Адзін—вялікі задзірака, другі, бы крэмень— няўступака.

Ажаніўшыся, дый абдзяціўшыся яны быццам крыху устаткаваліся. Аднак-жа чапаць іх на'т на вечарынах ці іншых нейкіх забавах ці парадах — баяліся. Каму, па палажэньню: наложаць у загрывак а іх — ні—ні. На'т брыдка аблаяць рэдка каму здаралася.

І вось нек вёску ўсю бы гром ашарашыла вестка: „Братэльнікі“ б'юцца.

Усе, хто мог,— туды. Біліся на полі, на шнурох.

За глупства пайшло; расла там недзе на іхняй супольнай мяжы старая дзічка — груша. Мала іх яна цікавіла. А дзеці, гледзячы на дружбу бацькоў заўседы стараліся згодна і уроўні ірваць грушкі.

Праўда, ня раз абыдвае скардзіліся, што груша надта шкодзіць. Зьбіраліся на'т яе зсячы. Але ўсё нек не маглі здабыцца на гэта. І вось Язэп, як болей шпаркі, зазлаваўшыся на тое, што стары сук адарваны бурай ад грушы зваліўся на яго лён і шмат папсаваў яго, — схапіў тяпор, шах — мах, дый і адрубаў сукі з боку свайго шнура.

Гэта ўгледзіў Петра, дый да Язэпа:

— Што-ж ты, браток, самавольнічаеш? Груша — агульная. Разам зьбіраліся сячы. А тут — ты сам. Дый яшчэ накідаў вось сукоў на мой гарох? Як-жа так?

— А вось так! —загарэўся Язэп.— Буду я чакаць пакуль ты расцялёпаеш патрэбу зсячы непатрэбнае і шкоднае дрэва. А сукі, што на тваім шнуру — можаш сабе браць! Дарую табе.

— Даруеш? Га? які пан знайшоўся! Падавісь імі сам! Ураз-жа бяры іх, ачышчай шнур!

— Што? Гэта ты мне? Прыказы даеш?!

— А хто ж? думаў, што прыяцель, дык усё табе можна? Кажу зьбірай, а то..

— Што то? Што? Ну-тка даказывай!

— А тое, што я гэтымі сукамі і цябе і твой шнур закідаю!

— А, вось як! Ах, ты падлюга! Такі-сякі!

І пайшло: далей-балей, дайшло да кулакоў. Абое былі аднае сілы. Як шчапіліся дык ледзь разьнялі. Скрывавілі свае фізыі, разьбілі насы, вушы...

Доўга яшчэ са двароў абаіх нясьліся пагрозы і лаянка.

А на другі дзень ледзь-сьвет, абое цішком адзін ад аднаго запраглі коней, ды ў мястэчка. Суседзі адразу ўцямілі: няйначай у Суд. Нельга-ж гэткую справу пакінуць... Няма таго звычаю...

—..—

У мястэчку канешна бачылі адзін аднаго. Але трымаліся здалёку, каб не спаткацца. Абое разумелі, што прыехалі за адным: пісаць прашэньні. Адвакат у мястэчку быў адзін і кожны стараўся, каб неяк выпярэдзіць другога. Але як зрабіць? дарога абаім адна.

І вось, каб зьмыліць адзін аднога — пайшлі сьпярша ў крамкі, быццам купіць нешта. Але з пад вока пільна сачылі за сабой Угледзіць гэта адзін, што другі вымкнуўся з крамкі ды хілкам прэ ў бок адваката — шмыг таксама на вуліцу. Той угледзіць — ізноў у крамку. І так яны шмыгалі і хаваліся доўга. Урэшце Язэп — што-то гарачка! — шмыгануў з крамкі, дый ужо ня гледзячы на'т, што з Пётрай пагнаў аж бежкі па вуліцы... Пётра аж зьзелянеў:

— Іш, гад! Апярэдзіў! Каб цябе, каб цябе!

Змаркоціўся шыбка, але — нічога не парадзіш:

Змарудзіў, вось і астаўся ў дураках.

— Чакай-жа. Ты бярэш гэтага, тутэйшага? Добра! Нічога не пашкадую, вазьму адваката ў горадзе! Ен цябе, браток замуруе! злосна думаў Пётра.

Распытаў жыдкоў, які з лепшых ёсьць адвакатаў, пакінуў каня з возам на апецы знаёмага, дый на чугунку.

Шмат гэта яму каштавала. Але вярнуўся здаволяны. Козырам хадзіў па вёсцы, пагражаў:

— Папомніць мяне! Згнаю ў турме! Будзе ведаць як біцца са мною!,.

Язэп так сама не заставаўся ў даўгу: тым самым пагражаў.

І часта па вечарох забаўляліся суседзі тым, як гэтакія нядаўныя прыяцелі з двароў сваіх кідалі адзін аднаму пекныя слоўцы ды сьвірэпныя пагрозы.

—..—

Прыйшоў даўно даўно чаканны Суд.

— Чакай, пасядзіш ты ў мяне, крэпка! Пагражаў Язэп Пётру.

— Пагодзьцеся, радзіў судзьдзя. Гэтак блізка жывеце, былі гэтак дружны...

Дзе там! Абое і слухаць ня хочуць!

— Як-жа мірыцца? узбурана кажа Язэп: гэтак адлупцаваў мяне.. Ізноў-жа выдаткі..

— Ні за што я з ім мірыцца ня буду! Я яго ня чапаў, а ён грушу... а потым мяне... Зьбіў ўшчэнт... урчаў Пётра.

— Ну, як хочаце, кажа судзьдзя. Але я вам рою падумаць. Пайшло у вас за глупства. Прыкрасьці і расходы абоім А толк які? Пабілі адзін другога. Па Закону, значца, справа за ўзаемнасьцю пабояў кончыцца нічым...

— Як нічым? уздрыгануліся абое: значца ён сядзець ня будзе? пытаюцца у судзьдзі у адзін голас...

— Не, ня будзе...

Маркотна, ахаючы дый шукаючы розузуму у паталіцы выслухалі Язэп з Петрай прыгавор Суду.

Прабавалі гаварыць, ды судзьдзя спыніў.

— Вось дык справядлівасьці! кіпеў Язэп выходзячы з залі Суду.

— Вось табе і пасадзіў.. сумна бурчэў Пётра. Узаемнасьці! Гм...

Круціўся па калідору нейкі панок, быццам адвакат, бо ў хвастатай вопратцы.

Пётра — шмыг да яго.

— Зрабеце ласку, панок, паясьніце, якжа гэта выйшла? Мо' абмылка? Ен жа пабіў мяне?

— Але; аднак і вы пабілі яго. Значыцца узаемна пабіліся.

— А калі-б я ня біў яго, а толькі ён мяне?

— Ну, тады пэўне-ж яго-б Суд асудзіў.

— І сядзеў-бы?

— А куды-ж бы дзеўся?

— Вось дзякую! Ен паб'е мяне, як Бог сьвят... Гарачы надта. А я яго — ані-ні. І пальцам ня крану... Хай пасядзіць!

— Іш: мала яму; яшчэ нараджаецца з адвакатам, дурань: — бурчэў злосна Язэп. Парадзься, парадзься! Паможа, а як-жа! Толькі грошы бяруць ды паперу псуюць...

— А вось і буду раіцца — агрузнуўся чуўшы гэтае бурчэньне Пётра. Усё роўна пасаджу цябе. Я-ж ведаю: ты гарачы, ня ўцерпіш. Злупцуеш мяне...

— Адстань, злыдня, а то... махануў у бок Пётры Язэп,

— Вось—вось: што „а то“? Я-ж кажу ня сьцерпіш... У... гарачы ты, падлюга!,.. Віўся каля Язэпа Пётра, выходзячы на двор Суду.

— Кажу адстань, ня ўвадзі ў грэх! ужо грымеў Язэп.

— Во—во! ўжо распаліўся! Мо ў морду дасі? Ну дай, ну, ну?. наседаў Пётра

— Адстань, каб цяче хвароба! Запраўды не сьцярпеў Язэп і таўкануў ад сябе Пётру.

— Ай — яй! каравул! Людзцы добрыя ратуйце! Забіў, забіў! Закрычэў не сваім голасам Пётра і грымнуў на зямлю.

Язэп хацеў быў даць стрэкача, але ў той жа мамэнт зьявіўся паліцыянт які схапіў яго за руку.

— Людзцы добрыя! Бачыліўсе: я яго не чапаў ані пальцам, а ён мяне пагледзьце: ў кроў пабіў.. Галасіў размазваючы кроў з носу рукой па твару Пётра, якога паднялі з зямлі.

— Але, але! пацьвердзіў паліцыянт. Усе бачылі. Будзе строга адказываць...

— Ай,—ай ен чыў Пётра. Пасадзяць яго, а, пане паліцыянт?

— Пасадзяць і то крэпка!

— Хвала-ж табе Божанька! Перакрэсьціўся і аж зазіяў здаволеньням Пётра. Дачакаўся! — Казаў-жа я табе — не ўцярпеў і зьвярнуўся ён да Язэпа: ты ня сьцерпіш, а я ні-ні,.. Вось і пасаджу ў турму! Згніеш там разбойнік!...

Б. Друцкі.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.